# УСМІХНІСЯ!

АКЦЫЯ

18 лістапада 2017 года атрад валанцёраў «Дабрыня» з ліку навучэнцаў нашага каледжа правёў акцыю «Усміхніся» для дзяцей-інвалідаў з раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, а таксама маленькіх пацыентаў з ліку амбулаторных хворых. У неўралагічным аддзяленні цэнтральнай раённай бальніцы адкрыліся новыя кабінеты для аздараўлення, лячэння і рэабілітацыі, у якіх нашы валанцёры правялі з дзецьмі шэраг займальных гульняў, загадвалі загадкі. Арганізавала такое карыснае мерапрыемства кіраўнік аб'яднання па інтарэсах Алёна Уладзіміраўна Гапоненка.



Пасля гульняў валанцёры займаліся з дзецьмі на трэнажорах, вучылі іх карыстацца імі, падстрахоўвалі. У дзяцей засталіся добрыя ўражанні, і ўсмешка не сыходзіла з іх твараў. Дзеці былі ўдзячныя нашым хлопцам за такое мерапрыемства.

Юнакоў і дзяўчат з ліку навучэнцаў нашага каледжа заўсёды радыя бачыць, і з нецярпеннем чакаюць не толькі дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, але і выхаванцы сацыяльна-педагагічнага цэнтра ў Сонечным, і наведвалькікі аддзялення дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.



Нашым хлопцам таксама падабаецца ўзаемадзейнічаць з людзьмі, якім неабходная іх увага, яны заўсёды падтрымліваюць Алёну Уладзіміраўну з яе ідэямі каму-небудзь дапамагчы. Толькі такімі практычнымі дзеяннямі выхоўваецца сапраўдная міласэрнасць і дабрыня.

***Панасюк Эдуард, гр.2-58***


Насценгазета «Весці ПДАТК»
**№52, лістапад 2017**
Выдаецца аб'яднаннем па інтарэсах «Журналістыка» ўстановы адукацыі «Пружанскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж»

**Галоўны рэдактар:**
Апарына А.Г.
**Матэрыялы падрыхтавалі:**
Карповіч К.М., Ляўчук К.С., Барышнікаў І.У., Сітко А.А., Панасюк Э.Ю., Маркаў Д.У., Каранчук М.А., Гардзей В.Г.



**Наш адрас:**
вул. Чырвонаармейская, 11, 225133
г. Пружаны Брэсцкай вобл.,
тэл./факс (801632) 21478
e-mail: ubeley@tut.by, college@brest.by